ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік галоўнага ўпраўлення адукацыі Гродзенскага аблвыканкама
Р.Ю.Абрамчык
07.10.2024

# І (ШКОЛЬНЫ) ЭТАП РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ “БЕЛАРУСКАЯ МОВА” І “БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА”

**Х клас**
**Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры**
*Кастрычнік 2024 г., Гродна*

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Балы | | | | | | | | | | | |
| Подпіс члена журы | | | | | | | | | | | |

**Заданне 1.** Запішыце гукі, якія вымаўляюцца на месцы выдзеленых літар.
*Максімальная колькасць балаў – 4*

| | | | |
|---|---|---|---|
| па**д**чарка | [ ] | збяруся **і** паеду | [ ] |
| **с**хіліцца | [ ] | па-сусе**дс**ку | [ ] |
| **з** мяне | [ ] | аб'е**здж**аны | [ ] |
| аб’е**здч**ык | [ ] | н**е** ведаю | [ ] |
| **з** кім-небудзь | [ ] | ра**зж**ыцца | [ ] |
| выхваляе**шся** | [ ] | Іван **і** Васіль | [ ] |
| на палі**ч**цы | [ ] | ва**к**зал | [ ] |
| хрэ**сь**біны | [ ] | **с**меласць | [ ] |

**Заданне 2.** У сказах знайдзіце словы з арфаграфічнымі і акцэнталагічнымі памылкамі. Запішыце нарматыўны варыянт.

*Максімальная колькасць балаў – 5*

| Сказы з памылкай | Нарматыўнае напісанне |
|---|---|
| 1. Уваход у залу толькі па прапусках. | |
| 2. Падчас гульні ў карты на руках у Антося засталася пікавая дама. | |
| 3. У летніку было пяціразавае харчаванне. | |
| 4. У цеста маці любіла дабаўляць сываратку. | |
| 5. Кірыл лавіў на вуду тоўсталобікаў. | |

**Заданне 3.** Пераблыталіся словы і іх вобразнае апісанне – перыфразы. Знайдзіце гэтыя пары і запішыце.

*Максімальная колькасць балаў – 6*

| | |
|---|---|
| 1. неба | а. крывавая завіруха |
| 2. жаўранак | б. беларускі шоўк |
| 3. лес | в. лясная варажбітка |
| 4. бабёр | г. пяты акіян |
| 5. зоркі | д. зялёнае мора |
| 6. каханне | е. балотны цясляр |
| 7. вайна | ж. радасць жыцця |
| 8. бульба | з. другі хлеб |
| 9. маладосць | і. срэбны званочак |
| 10. лён | к. прадзедаў зямля |
| 11. радзіма | л. нябесныя вочы |
| 12. зязюля | м. жыццёвы ранак |

**Адказ:** 1___, 2___, 3 ___, 4 ___, 5 ___, 6 ___, 7 ___, 8 ___, 9 ___, 10 ___, 11 ___, 12 ___

**Заданне 4.** Вызначце, да якіх часцін мовы адносяцца наступныя словы. Аб’яднайце ў групы па часцінамоўнай прыналежнасці *(напрыклад, назоўнік: …., лічэбнік: ….),* запішыце.

*Максімальная колькасць балаў – 5*

Абодва, двое, удвая, двойка, другі, удвух, падвоіць, двойчы, падвоены, па-другое, падваенне, падвоіўшы, дваякі, двойня, двайны, дзве, двоечнік, двайнік, двухтысячны, дзвесце.

______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________

**Заданне 5.** Узнавіце фразеалагізмы, дапісаўшы адпаведныя займеннікі ў патрэбнай форме. У дужках укажыце разрад займенніка.

*Максімальная колькасць балаў – 4*

а) зарубіць_______________на носе (_______________________);
б) на__________ __________капыл (перарабіць) (_________________________);
в) на ___________ _____лады (_____________ __________);
г) не з_____ _________ ____рукамі (_________________________);
д) паспытаць_______ __________хлеба (__________________________);
е) чуць на____________________вушы (__________________________);
ж) як на______ __________________ __ліха (________________________);
з) скінуць з___________________ветхага Адама (________________________).

**Заданне 6**. Вызначце, як трэба пісаць словы, пастаўце адпаведную лічбу: разам (1); асобна (2); праз злучок (3).

*Максімальная колькасць балаў – 5*

| | | | |
|---|---|---|---|
| скрывіўся (па) пакутніцку | | (усё) роўна не прыйдзе | |
| чытаць (на) хаду | | усе мелі (па) роўну ўсяго | |
| стаяць (на) смерць | | гэтак (сама) паводзіць сябе | |
| бралася (на) відно | | (што) колечы падрыхтаваць | |
| глядзець (па) доўгу на дарогу | | пісаць (па) латыні | |

**Заданне 7.** Да слоў у левым слупку падпарыце спосабы іх утварэння. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння лічбаў і літар.

*Максімальная колькасць балаў – 5*

| | |
|---|---|
| 1. заграніца | А. Асноваскладанне |

| | |
|---|---|
| 2. лодачнік | Б. Бяссуфіксны |
| 3. падспудны | В. Прыставачна-суфіксальны |
| 4. інтэлектуал | Г. Прыставачны |
| 5. суднабудаванне | Д. Словаскладанне |
| | Е. Суфіксальны |

**Адказ:** 1 ____, 2 ____, 3 ____, 4 ____, 5 ____

**Заданне 8.** Расстаўце, дзе патрэбна, знакі прыпынку. Запішыце, чым ускладнены кожны сказ.

*Максімальная колькасць балаў – 6*

1. Малы хлапчук унучак дзедаў сядзеў на возе. ______________________
______________________________________________________________
2. Лёд бы камень самацветны блішчыць праменнаю ігрой. ___________
______________________________________________________________
3. Давайце добрыя сябры пагутарым аб шчасці. _____________________
______________________________________________________________
4. Людзі а іх было багата проста за жываты хапаліся ад смеху. _________
______________________________________________________________
5. Васіль Талаш ва ўзросце 75 гадоў арганізаваўшы і ўзначаліўшы партызанскі атрад змагаўся на Палессі супраць польскіх войскаў у 1919 – 1920 гг. ____________________________________________________
______________________________________________________________
6. Скажы калі ласка куды ты будзеш паступаць вучыцца? ___________
______________________________________________________________

**Заданне 9.** Узнавіце верш Міколы Мятліцкага “Беларускае кнігадрукаванне”, запоўніўшы пропускі.

*Максімальная колькасць балаў – 5*

Бачу гэты ёмісты том,
Дзе на ўступных старонках
Славянская вязь
_________________________ першадрукаў,
Уквечная адмысловымі гравюрамі,
З усемагчымымі завіткамі-кудзеркамі
Нашай старажытнай кірыліцы.
Далей ідуць друкаваныя спехам
Шрыфты ________________________
І ________________________________.

І вось ужо, аўтарствам кмечаныя,

Творы ________________________________,
___________________________ абарончыя вершы,
Гнеўныя вершы-адозвы Цёткі,
Бунтарныя паэмы і вершы __________________________,
Яго драматургічныя творы.
Усеахопныя творы ____________________________,
Шчымліва-самотныя радкі _________________________,
На вайне беззваротна страчаных,
А дальш – ацалелых у ліхалеццe –
_______________, _______________, Мележа…
І далей, і далей –
За старонкай старонка…
Толькі ўсемагутнымі рукамі
Народа майго
Можна том гэты ёмісты
Узняць над зямлёй
І разгарнуць,
Каб тыя, што яго стварылі
І ўжо сёння ля зорак,
Змаглі прачытаць
У 500-гадовым аб'ёме
Нашу кнігу жыцця.

**Заданне 10.** Прачытайце ўрыўкі. Успомніце аўтара і назву твора. Запоўніце табліцу.

*Максімальная колькасць балаў – 5*

| Урывак | Аўтар і назва твора |
|---|---|
| А. Не забыць сцежкі той, што цябе<br>На дарогу выводзіла з дому,<br>Што у хаце там быў рубель<br>У цане і па курсу старому.<br><br>Не забыць, як марозам злым<br>Клямка пальцы пячэ балюча<br>І адкуль на стале тваім<br>Бохан свежага хлеба пахучы. | |
| Б. Па-над белым пухам вішняў,<br>Быццам сіні аганёк,<br>Б'ецца, ўецца шпаркі, лёгкі<br>Сінякрылы матылёк.<br>Навакол усё паветра | |

<table>
<tr><td>Ў струнах сонца залатых,<br>Ён дрыжачымі крыламі<br>Звоніць ледзьве чутна ў іх.</td><td></td></tr>
<tr><td>В. Не паспелі сесці пры сустрэчы,<br>Як патэльня засквірчэла ў печы…<br>Бульба, смажаніна і каўбаска,<br>Пакаштуце, людцы, калі ласка!</td><td></td></tr>
<tr><td>Г. Ціха было і чыста<br>у полі яго дзяцінства,<br>былі агонь і дым<br>на полі ратным тым.</td><td></td></tr>
<tr><td>Д. На галаве ж у іх не грады<br>І нават не гарод,<br>А проста – цэлае шматполле:<br>Бульбянік тут развесіў голле,<br>Там далей – іншы кораньплод;<br>На самай макаўцы ячмень<br>Пад вецярком сабе шумеў,<br>А далей сырадэля<br>Так міла белым тварыкам глядзела,<br>І роем навакол гулі<br>Двухногія чмялі.</td><td></td></tr>
</table>